# Нарада па бібліятэчнай рабоце

Учора ў памяшканні Беларускай Дзяржаўнай бібліятэкі імені Леніна адкрылася нарада па бібліятэчнай рабоце, скліканая Наркомасветы БССР.

На ранішнім пасяджэнні заслухан даклад дырэктара Ўпраўлення бібліятэчнымі калектарамі БССР тав. Пекарчыка аб выніках камплектавання бібліятэк у 1940 годзе.

Садакладчык, інспектар па бібліятэчнай рабоце Беластоцкага аблана тав. Лахціна ўказала на адарванасць бібліятэчных калектараў ад масавага чытача. Работнікі калектараў часта не ўлічваюць запросаў насельніцтва, забяспечваюць бібліятэкі непатрэбнымі кнігамі.

Удзельнікі нарады тт. Марголіна (Бабруйск), Бабкова (Брэст) адзначалі дрэннае камплектаванне сельскіх бібліятэк кнігамі. Вельмі мала засылаецца масава-абароннай літаратуры, кніг на мовах нацыянальных меншасцей.

Сёння нарада прадоўжыць сваю работу.